Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

Ня бойся!

№ 6 (103), КРАСАВІК 2010 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт твайго ГАРАДКА

Цытата нумара:

Не важна, як прагаласавалі,-- важна, як падлічылі.

Ёсіф Сталін.

УЛАДА БЕЗ НАС

Амаль завяршылася чарговая кампанія, якую ўлады назвалі "Выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў 26 склікання." Кампанія праводзілася пасля ўнясенння касметычных зменаў у Выбарчы кодэкс, прынятых пад ціскам міжнароднай супольнасці. Еўрапейскія структуры, пастаянна адзначаючы неадпаведнасць выбараў на Беларусі дэмакратычным стандартам, патрабавалі ад кіраўніка краіны ўнясення зменаў у выбарчае заканадаўства, якія зрабілі бы выбары празрыстымі, дапусцілі апазіцыю да ўдзелу у працы камісій.

У кампаніі 2010 года беларуская улада засведчыла, што і далей будзе трымацца славутага прынцыпа: не галоўнае як галасуюць, а галоўнае, хто як лічыць. Мясцовыя райвыканкамы уклічылі ў склад участковых камісій на 99% прадстаўнікоў ад прадзяржаўных грамадскіх і партыйных структур. Пры гэтым, калі ад неапазіцыйных партый уключылі 95% вылучаных прадстаўнікоў, то ад апазіцыйных толькі 1%. Такія "дэмакратычныя" стандарты выбараў у краіне.

У гэтай кампаніі кандыдатамі пераважна сталі прадстаўнікі ўлады. На Віцебшчыне амаль не было альтэрнатыўных выбараў у райсаветы, а на Гарадоччыне -- дакладна: на 31 округу – 31 кандыдат ад улады. У нашым жыцці па меркаванню уладаў настаў рай, бо у раю Бог Адаму прапанаваў Еву і сказаў: "Выбірай!". Аналагічна паступілі і мясцовыя ўлады. Пры гэтым на Гарадоччыне кандыдаты ў райсавет, а ўсе яны на 90% з наменклатурнай абоймы, не палічылі патрэбным у агітацыйных улётках выкласці свае праграмы, прапановы выбаршчыкам аб сваёй плануемай дэпутацкай дзейнасці. Улёткі толькі з біяграфіямі кандыдатаў былі выдадзены накладам у 2-3 разы большым, чым выбаршчыкаў у акрузе. Такі своеасаблівы прэзент: пачытай і выкарыстай дзе трэба па патрэбе.

Саму ж працу камісій, куды , па сцвярджэнню арганізатараў выбараў з Цэнтрвыбаркаму і выканаўчыай улады, уключаны кампетэнтныя, дасведчаныя грамадзяне падмянілі іх старшыні. Не буду сцвярджаць пра ўсю краіну, а што так было на Гагарынскім участку №5 (старшыня Вячэслаў Грыбанаў) і ў Гарадоцкай раённай выбарчай камісіі камісіі (старшыня Наталья Бераснева) сцявярджаю дакладна. Норма заканадаўства аб тым, што па заявах аб парушэнні заканадаўства прымаецца рашэнне, норма заканадаўства аб тым, што камісія прымае рашэнне Вячэславам Грыбанавам і Натальяй Берасневай ігнаравалася дакладна. Сведчанняў таму пад дзесятак: у народзе кажуць – воз і маленькая цялежка.

Па выніках кампаніі былі напісаны пратаколы, якія засведчылі, што дэпутацкі корпус мясцовых Саветаў у краіне сфарміраваўся. І гэта так.

Улада сфармавала дэпутацкі корпус без нас. Без нашага рэальнага ўдзелу у камісіях. Без нашага рэальнага ўдзелу ў выбарчай кампаніі. Адбылася такая імітацыя: народ робіць выгляд, што галасуе, а ўлада, што праводзіць выбары. Гэта мне ў поўным аб'ёме давялося назіраць і на Гагарынскім участку №5, і ў працы Гарадоцкай раённай камісіі.

Улада засталася без прадпрымальнікаў. Самыя ініцыятыўныя людзі краіны, якія сваім розумам, мазалём здабываюць свой хлеб, якія забяспечваюць працай работнікаў, якія плацяць звышзборы, не маючыя аналагаў у цывілізаваным свеце, амаль ніяк не прадстаўлены ў Саветах. Ініцыятыўным прадпрымальнікам улада ўжо каторы год кажа пра нежаданасць іх прадстаўніцтва ва ўладзе. Па-тэлефону або тэт-а-тэт. І прадпрымальнікі робяць "правільны" выбар. Бо не адзін звычайны прадпрымальнік, далёкі ад палітыкі не будзе разыкаваць сваёй справай дзеля атрымання малазначнага статуса ў Савеце.

Улада засталася без канкурэнцыі. Цывілізаваны свет не магчыма прадставіць без удзелу апазіцыі ў палітычным жыцці. Па выніках кампаніі апазіцыя ў Саветах заўважна толькі ў астранамічны тэлескоп. Пра Палату прадстаўнікоў і казаць няма чаго. Другі тэрмін вышэйшы орган краіны стэрыльны ад іншадумства. Гэта здзіўляе "наіўных" еўрапейцаў, якія не бяруць дэпутатаў такога органа ў Эўранэст. Але не здзіўляе беларускія ўлады, якія паабяцалі не весці краіну за цывілізаваным светам.

Улада засталася без дыялогу. Кожныя выбары гэта магчымасць дыялогу кандыдатаў з грамадствам. Хуткахвілінныя выступы па радыё, агітацыйныя ўлёткі за крохі па свайму азначэнню не могуць быць дыялогам. На радыё, тэлебачанні, у газзетах не было дэбатаў. Беларускае заканадаўства гэта не прыдугледжвае. Так напісана ў заканадаўстве, складзеным у прадстаўнічым органе, легітымнасць якога цывілізаваныя еўрапейцы увесь час ставяць пад сумненне.

Улада засталася шмат без чаго пасля гэтай кампаніі. Але і народ таксама нічога не атрымаў. Маўкліва ў рэкордным тэмпе рушыўшы на датэрміновае галасаванне. Потым ціха праглынуў абвешчаныя вынікі. Мусіць, народ стаміўся. Ён спіць. Спіць у сваёй абаякавасці да ўлады, якая ладзіць такія кампаніі. Спіць у абаякавасці да таго, як за яго вырашаюць пытанне выбару. Выбару будучыні. Выбару накірунку развіцця. Які зусім не нагадвае цывілізаваныя еўрапейскія стандарты.

І ці абудзіцца народ у наступную прэзідэнскую кампанію? Вялікае пытанне.

Леанід Гаравы, дэпутат Гарадоцкага райсавета 25 склікання.

Гарадоцкія "вынікі" выбараў без разгляду скаргі

27 красавіка Гарадоцкая акруговая камісія №9 вырашыла лічыць Сяргея Старавойтава выбраным дэпутатам Віцебскага аблсавета. Скаргу кандыдата Леаніда Аўтухова аб прызнанні выбараў на Гагарынскім участку №5 несапраўднымі акруговая камісія не разглядала.

Леанід Аўтухоў на падставе дакументаў аб парушэннях на Гагарынскім участку №5, якія былі выяўлены пад час галасавання, падліку галасоў і падвядзення вынікаў на ўчастку, падаў скаргу сакратару камісіі Ларысе Кладкевіч. Кандыдат у скарзе прывёў пералік шматлікіх парушэнняў заканадаўства, якія былі выяўлены ў працы Гагарынскай камісіі, якой кіруе Вячэслаў Грыбанаў. Гэтыя парушэнні не даюць магчымасці прызнаць выбары на Гагарынскім участку сапраўднымі.

Леанід Аўтухоў прасіў камісію прызнаць выбары на Гагарынскім участку №5 па выбарах дэпутата Віцебскага абласнога Савета несапраўднымі, а таксама прыняць рашэнне аб дзеяннях Гагарынскай выбарчай камісіі №5 пры правядзенні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Пад час правядзення паседжання камісіі сакратар Ларыса Кладкевіч не праінфармавала членаў камісіі аб пададзенай скарзе на прызнанне выбараў дэпутата Віцебскага аблсавета на Гагарынскім участку несапраўднымі. Члены камісіі выканалі сваю працу, пазнаёміўшыся з пратаколамі участковых камісій і прагаласавалі за абранне Сяргея Старавойтава дэпутатам аблсавета.

Пасля завяршэння працы камісіі кандыдат Леанід Аўтухоў звярнуўся да старшыні камісіі наконт скаргі, якую абавязана была разгледзіць акруговая камісія да вынясення рашэння аб выніках выбараў.

Сакратар камісіі заявіла, што акруговая камісія не правамоцна разглядаць дадзеную скаргу, бо па арт.89 ч.8 гэтымі паўнамоцтвамі надзелена толькі вышэйстаячая камісія.

Леанід Гаравы, даверaная асоба кандыдата, растлумачыў камісіі, што гэта датычыцца працэдуры паўторнага падліку галасоў, а адпаведна нормы арт. 89 ч. 3 акруговая камісія абавязана абавязана прыняць рашэнне аб скарзе на сваім паседжанні.

Пасля працяглага абмена думкамі аб склаўшыйся сітуацыі, кандыдату і даверанай асобе атрымалася пераканаць камісію прыняць рашэнне аб пададзенай скарзе. Камісія павінна вызначыцца з рашэннем у трохдзённы тэрмін.

Л.Антонаў.

КІРАЎНІЦТВА ГАГАРЫНСКАЙ КАМІСІІ НЕ ЛІЧЫЛА ГАЛАСЫ

На Гагарынскім участку №5 г. Гарадка старшыня камісіі Вячэслаў Грыбанаў і сакратар Алёна Беланогава склалі адвольна пратаколы па пяці выбарчых акругах у мясцовыя Саветы.

Пасля завяршэння галасавання выбаршчыкаў старшыня камісіі Вячэслаў Грыбанаў пачаў працэс «падліку» галасоў па свайму разуменню, не карыстаючыся нормамі выбарчага кодэксу. З парушэннямі заканадаўства былі пагашаны бюлетэні і назіральнікі не даведаліся, колькі бюлэтэняў было невыкарыстана. На Акт аб парушэнні пры пагашэнні бюлетэняў Грыбанаў не прэраагаваў, адмовіўся яго разгледзіць.

Пры падвядзенні вынікаў датэрміновага галасавання члены камісіі расклалі бюлетэні па округах і перадалі кіраўніцтву камісіі. Старшыня камісіі даў каманду пакаваць бюлетэні без падліку галасоў пры выбарах у абласны савет і ніякіх вынікаў датэрміновага галасавання не агучыў. На Акт аб парушэнні пры падліку галасоў пры датэрміновым галасаванні Вячэслаў Грыбанаў не прэраагаваў, адмовіўся яго разглядаць. Ціха сядзеў на сваім старшынскім месцы і глядзеў за працай сакратара.

Хутка кіраўніцтва камісіі без падліку галасаў упакавала бюлетэні выбаршчыкаў, якія галасавалі на даму, а потым аналагічна паступілі са скрынямі, што стаялі ў памяшканні для галасавання. Пры упакаваных бюлетэнях, без рэальнага падліку, сакратар камісіі пачала з дапамогай калькулятара падганяць лічбы для ўнясення ў пратакол. І калі бюлетэні запакавалі на пачатку адзінацатай гадзіны, то першы пратакол для падпісання членам камісіі сакратар дала каля паловы дванаццатай.

Ужо ўсе камісіі раёна здалі пратаколы ў вышэйшыя камісіі, а на Гагарынскім ўчастку сакратар камісіі шчыравала над лічбамі для пратакола. Настаў панядзелак, але ў Гагарынскай камісіі ўсё шчэ пісалі пратаколы. Толькі каля гадзіны ночы Вячэслаў Грыбанаў хутка прачытаў з цяжкасцю складзеныя пратаколы, якія не маюць нічога агульнага з волевыяўленнем выбаршчыкаў Гагарынскага ўчастка. Пратаколы адлюстроўваюць толькі меркаванне кіраўніцтва камісіі.

Кандыдат у дэпутаты па Гарадоцкай акрузе №9 Леанід Аўтухоў падаў у Гарадоцкую пракуратуру заяву аб парушэнні правядзенні выбараў на Гагарынскім участку без падліку галасоў. Да заявы дадзены Акты аб парушэнні працэдуры падліку галасоў, якія склаў Леанід Гаравы, даверaная асоба кандыдата. Таксама кандыдат падаў заяву ў акруговую камісію наконт не прызнання вынікаў галасавання на Гагарынскім участку на выбарах у аблсавет.

Л. Антонаў.

"Гасцінец" ў Інтэрнэце

Шаноўны чытач! Раней чым з паштовай скрыні вы можаце чытаць нашу газету ў Інтэрнэце. Газета размешчана на сайце http://haradok.belarda.org/ і яе магчыма спампаваць у раздзеле "Незалежныя выданні" на старонцы "Гасцінец".

Вынікі апошняга апытання на сайце http://haradok.belarda.org/

Ці магчымы на Беларусі кіргізкі сцэнар?

Не 46%
Магчыма, калі ўзрасце жабрацтва 22%
Магчыма, калі ўзрасце карупцыя 18%
Магчыма, калі ўзмацніцца апазіцыя 4%
Магчыма, калі пажадае Расія 10%

АБ'ЯВА

- *Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.*
- *Рэдакцыя "Гасцінец" змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.*
- *Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас: Гарадок, вул. Галіцкага д.16 кв.2 ў кожны аўторак і чацвер з 16 да 18, або на тэлефоны газеты «Гасцінец».*
- *Жадаючыя атрымаць у карыстанне беларускія кнігі, часопісы або іх набыць звяртайцеся на адрас: Гарадок, вул. Галіцкага д.16 кв.2 ў кожны аўторак і чацвер з 16 да 18, або на тэлефоны газеты «Гасцінец»*
- *Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.*

“Датэрміноўшчына”

25 красавіка выбаршчыкі мелі магчымасць прыйсці на выбарчыя участкі і прагаласаваць за кандыдатаў або супраць іх. Прагаласаваць у дзень, калі кампетэнтныя назіральнікі часткова мелі магчымасць бачыць рэальны працэс галасавання і паліку галасоў. Не за застаўся за межамі назірання у гэтай кампаніі і той факт, што каля трэцці выбаршчыкаў па краіне у дзень выбараў не будзе знаходзіцца па месцы свайго пражывання і таму яны прагаласавалі датэрмінова. Такая гіганцкая міграцыя выбаршчыкаў Беларусі перад днём выбараў, якую магчыма было ўявіць у перыяд эвакуацыі напачатку вялікай вайны. Гэта міграцыя павінна прынесці не менш гіганцкія прыбыткі аўтамабільнаму, чыгуначнаму транспарту краіны, ды і аўтазаправачным станцыям. Толькі у рэальнасці гэтай міграцыі не было. Гэтым “датэрміноўшчыкам” з дзяржаўных прадпрыемстваў, бюджэтных арганізацый, пенсіянераў, якія “атрымліваюць”пенсію ад Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі або якую ён “дае” пенсіянерам, “загадалі --папрасілі” кіраўнікі арганізацый, паведамілі участковыя камісіі ў запрашэннях, штодня інфармавалі і дзяржаўныя радыё, і не менш дзяржаўнае тэлебачанне. Па нормах заканадаўства ніякіх дакументальных сведчанняў адсутнасці па месцы жыхарства не трэба. Але, як ва ўсіх папярэдніх выбарчых кампаніях з 2000 году, так і ў гэтай выбарчай кампаніі, мне, назіральніку з багатым досведам, ніводнага разу на самых розных выбарчых участках не давялося пачуць, адчуць цікавасці ў членаў камісіі да гэтага масавага “феномена”. Пры поўнай абаякавасці, незацікаўленасці да “феномена” масавага выезду выбаршчыкаў члены камісіі з вялікай радасцю выдавалі бюлетэні кожнаму з’явіўшымуся выбаршчыку. Радасць, мусіць, праменілася ад пачуцця набліжэння да выканання задання, ад задавальнення ў дагаджэнні вышэйстаячаму кіраўніцтву, якое зацікаўлена ў масавым датэрміновым галасаванні.

У рэальнасці жа гэта выклікана канфармізмам, здрадніцтвам закону, праўдзе, сумленню. Пры фашызме ў канцэнтрацыйных лагерах супрацоўнікаў не адразу ставілі да крэматорыяў, газавых камер і г.д.. Спачатку яны служылі пры ахове перыметру, потым ля баракаў, а потым ужо былі згодны выконваць самыя нечалаечыя загады, страчваючы сваё людское аблічча.

Пры ўсёй сімпатыі аднаго кіраўніка да спадчыны шалёнага фюрэра на Беларусі іншая сітуацыя. Але улада праз шэраг выбарчых кампаній, праз прымусовую кантрактную сістэму працы выхавала канфармізм у паводзінах пры датэрміновым галасаванні. Нашы людзі лепш пагадзяцца пайсці на датэрміновае галасаванне за межамі закону, чым будуць адстойваць сваё права галасаваць у дзень выбараў. “Жадаеце, каб прагаласаваў? Зраблю, бо мне ўсё роўна.” Такімі стандартамі паводзін карыстаецца вялікая армія выбаршчыкаў. І цяжка ўявіць, каб у якойсьці цывілізаванай краіне дырэктар прадпрыемства, арганізацыі мог загадаць выбаршчыку пайсці галасаваць датэрмінова. Праз пару дзён ён сядзеў бы ужо на лаве падсудных. А у нас па краіне такіх кіраўнікоў легіён. Наогул, у датэрміновым галасаванні ў апошнюю кампанію ўдзельнічала больш двух мільёнаў выбаршчыкаў. Вось і квітнее у краіне пачварная з’ява – “датэрміноўшчына”. І чым больш “датэрміноўшчыны”, тым менш свабоды і дэмакратыі. І разумным людзям гэта відавочна. А дурням і не трэба даказваць. Яны і далей з тэлеэкрана будуць далдоніць пра “росквіт” дэмакратыі на Беларусі.

Л. Гаравы.

Пенсію ліквідатара толькі праз суд

Анатоль Андрэяў, ліквідатар на Чарнобыльскай АЭС, толькі праз суд дабіўся назначэння законнай льготнай пенсіі. 23 красавіка суддзя У.К. Гладкоў задаволіў яго зыск да упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гарадоцкага райвыканкама наконт ушчамлення яго грамадзянскіх праў.

Ліквідатар звярнуўся ў Гарадоцкі суд ў сувязі з тым, што упраўленнне сацыяльнай абароны Гарадоцкага райвыканкама ўшчамляе яго правы на выхад на пенсію з 50 гадоў. Заканадаўства гарантуе ліквідатарам аварыі на ЧАЭС такі выхад на пенсію, калі яны ў 1986 годзе, годзе жахлівай аварыі, працавалі хаця бы адзін дзень ў дзесяці кіламетровай зоне. У рэальнасці гэта азначае, што ліквідатары па вайсковаму загаду выходзілі на разбураны чацвёрты энергаблок у зону звышнебяспечнай радыяцыі.

У лютым Анатоль Андрэяў прадставіў Гарадоцкаму райсабесу даведку з архіву, што ён 28 лістапада 1986 года, знаходзячыся на вайсковых зборах у 30 кіламетровай зоне, «убывал» на трэцці энергаблок ЧАЭС. Адначасова з гэтым ён прасіў прадставіць яму льготную пенсію з дня звароту. Ліквідатар даведаўся аб дадзенай льгоце толькі на 56-м годзе свайго жыцця і разлічваў на неабыякавыя адносіны да сваёй заявы.

Але яго зварот не быў задаволены, бо чыноўнікі з аддзела палічылі, што няма даведак працадаўцаў, у якіх захаваліся пярвічныя дакументы аб працы ў 10-кіламетровай зоне. Адначасова з гэтым параілі абскарджваць адмову ў Гарадоцкім райвыканкаме. Фактычна ў саміх сябе, быццам бы ў райвыканкаме ёсць іншыя адмыслоўцы, якія ведаюць нормы пенсійнага заканадаўства.

Анатоль Андрэяў не стаў хадзіць па райвыканкамаўскіх кабінетах, а падаў скаргу ў Гарадоцкі суд на дзеянні дзяржаўнага органа, які ўшчамляе яго грамадзянскія правы.

Пад час судовага паседжання суддзя Уладзімір Гладкоў высветліў, што супрацоўнікі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне не знаёмы з нарматыўна прававымі актамі Міністэрства абароны, якія рэгламенціруюць выданне загадаў у вайсковых частках. Адпаведна беларускага заканадаўства ў Міністэрстве абароны няма ніякай неабходнасці складаць даведкі, даваць камандзіровачныя, каб падцвердзіць выкананне загада. Па нормам Міністэрства абароны на вайскоўцаў пішацца загад аб тым, што «лічыць убыўшым», калі даецца загад на выкананне дзеянняў за межамі часткі, а потым аддаецца загад «лічыць прыбыўшым». І ўсё. Больш ніякай дакументацыі ў войску не вядзецца. Быццам бы было магчыма адзначаць камандзіроўку на трэццім энергаблоку ЧАЭС, куды камандзіраваўся Анатоль Андрэяў.

У суддзе таксама высветлілася, што ў працы Гарадоцкага райваенкамата няма практыкі інфармавання ліквідатараў з 10-кіламетровай зоны ЧАЭС аб магчымасці атрымання льготнай пенсіі з 50 гадоў. Атрымліваецца, што калі дзяржаве была неабходна дапамога ў ліквідацыі катастрофы, то армія загадала выканаць грамадзянам свой доўг. А калі грамадзяне пацярпелі пры выкананні доўга, то іх фактычныя працадаўцы з Міністэрства абароны не паведамляюць льготнікам аб існаванні льгот. Не па-людскі гэта атрымліваецца ў нашай дзяржаве, дзе так шмат гаворыцца пра клопат аб грамадзянах. Было б добра, каб словы не разыходзіліся са справамі. І Міністэрства абароны накіравала бы інфармацыю ўсім ліквідатарам катастрофы на ЧАЭС, якія маюць льготы на пенсіі адпаведна дзеючага заканадаўства.

Рашэнні Гарадоцкага суда ўступіць у законную сілу 4 траўня, калі дзяржаўны орган яго не абскардзіць.

Леанід Гаравы.

УЛЁТАК У ТРЫ РАЗЫ БОЛЬШ, ЧЫМ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Кандыдаты ад улады нічога не абяцаюць выбаршчыкам Гарадоччыны.

Немэтавае выкарыстанне бюджэтных сродкаў выявіў актывіст Руху «За Свабоду!» Леанід Гаравы пры вырабе інфармацыйных матэрыялаў кандыдатаў у дэпутаты Гарадоцкага райсавета.

За подпісам Гарадоцкай раённай выбарчай камісіі на Гарадоччыне распаўсюджваюцца інфармацыйныя матэрыялы кандыдатаў у дэпутаты. Пры законнасці выпуску інфармацыйных матэрыялаў увагу актывіста прыцягнулі дзве акалічнасці. Па-першае, матэрыялы не ўтрымліваюць праграмы ддзейнасці кандыдатаў, а толькі даюць кароткую інфармацыю аб біяграфіі кандыдата. Між тым арт. 75 ВК РБ кажа, а Віцебская абласная камісія настойвае, што выкарыстанне правоў на агітацыю магчыма, калі кандыдат паведамляе праграму сваёй дзейнасці. Фактычна кандыдаты на выбары ідуць нічога не прапаноўваючы выбаршчыкам. Такія стандарты агітацыі кандыдатаў у мясцовыя саветы пагарадоцку.

Па-другое, пры сярэдняй колькасці выбаршчкаў на акругу – каля 650 асоб, наклад кожнага выраблянага заказа роўны дзвюм тысячам. Кожны выбаршчык Гарадоччыны атрымае аж тры лістка ад кандыдата з біяграфіяй. Пры нястачы улётак для кандыдатаў у абласны савет, дзе акругі больш 12 тысяч, а вырабіць максімум магчыма 6500 улётак, такая «раскоша» выклікае здзіўленне. Навошта больш тысячы нікаму не патрэбных улётак. У прыбіральні выбаршчыкі ўжо ходзяць з адмысловай паперай.

Пытанні наконт не мэтавага выкарыстання бюджэтных сродкаў на Гарадоччыне актывіст Руху «За Свабоду!» Леанід Гаравы задаў старшыні Віцебскай абласной выбарчай камісіі ў адмысловай заяве. З адказу старшыні камісіі У. Мядзельца вынікае, што ніякіх парушэнняў у «такім» вырабе агітацыйных плакатаў няма. Але камісія ніякага рашэння аб заяве на парушэнне заканадаўства не прыняла, вывучыла пытанне не ў поўным аб’ёме і не па сутнасці пастаўленых пытанняў. У народзе пра такое кажуць: ты яму пра Ярому, а ён табе пра Фаму.

Л. Антонаў.

Віцебскую абласную камісію “папрасілі” на вуліцу

Кандыдат у дэпутаты Віцебскага аблсавета Леанід Аўтухоў 28 красавіка не здолеў трапіць у пакой Віцебскай абласной камісіі, каб падаць скаргу на незаконнае рашэнне Гарадоцкай акруговай камісіі. Уладзімір Мядзелец, старшыня Віцебскай абласной камісіі, вызваліў памяшканне для рамонту.

Логіка дзеянняў віцебскіх чыноўнікаў зразумела: сваіх кандыдатаў мы выбралі, а скардзіцца могуць толькі апазіцыянеры. Дык хай пабегаюць па Віцебску.

Леаніду Аўтухову давялося звярнуцца да супрацоўніка ідэалагічнага аддзела аблвыканкама, які толькі пасля тлумачэнняў зразумеў, што кандыдат у дэпутаты і на трэці дзень пасля выбараў мае права звяртацца са скаргамі ў абласную камісію і назваў адрас працы старшыні камісіі.

Зарэгістраваць скаргу Леаніду Аўтухову атрымалася толькі ў будынку Віцебскай абласной арганізацыі ФПБ у падначаленай Уладзіміра Мядзелеца.

У скарзе Леанід Аўтухоў адзначае, што 27 красавіка ў 8.55 сакратар Гарадоцкай акруговай камісіі Л.І. Кладкевіч зарэгістравала скаргу на парушэнні на Гагарынскім выбарчым участку №5 г. Гарадка у ходзе выбараў, падліку галасоў, пры вызначэнні вынікаў выбараў, якія паўплывалі на вынікі выбараў дэпутата Віцебскага аблсавета па Гарадоцкай выбарчай акрузе за ўваходным №9.

У пададзенай скарзе кандыдат прасіў прызнаць выбары на Гагарынскім участку па выбарах дэпутата Віцебскага абласнога Савета несапраўднымі.

Леанід Аўтухоў адзначае, што 27 красавіка адбылося паседжанне Гарадоцкай камісіі №9 і камісія вырашыла лічыць Старавойтава С.І. выбраным дэпутатам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў па Гарадоцкай выбарчай акрузе №9. Сакратар камісіі Кладкевіч Л.І. не праінфармавала камісію аб скарзе кандыдата ў дэпутаты, камісія скаргу не разглядала, па ёй рашэнне не прымала.

Кандыдат Леанід Аўтухоў у сваёй скарзе патрабуе наступнае:

«1. Прызнаць рашэнне Гарадоцкай акруговай камісіі №9 ад 27.09.2010 аб абранні Старавойтава С.І. дэпутатам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў па Гарадоцкай выбарчай акрузе №5 незаконным.

2. Абавязаць Гарадоцкую акруговую камісію №9 разгледзіць пададзеную скаргу ў поўным аб’ёме з усімі патрабаваннямі беларускага заканадаўства па разгляду зваротаў грамадзян.

3. Прыняць меры для праўдзівага інфармавання выбаршчыкаў Гарадоцкага раёна, а таксама Віцебскай вобласці ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі аб ходзе выбараў на Гагарынскім выбарчым участку №5 па выбарах дэпутата Віцебскага абл, дзе камісіяй кіруе Грыбанаў В.Ф.»

Цяжка спадзявацца на аб’ектыўны разгляд скаргі камісіяй, якая ужо пазбаўлена свайго афіцыйнага месца. Зараз члены Віцебскай камісіі, быццам бы апазіцыянеры, будуць збірацца дзе давядзецца. Ды і ці будуць? Ёсць вялікае сумненне у тым, што яны, а не вышэйстаячыя чыноўнікі, будуць прымаць рашэнне па скарзе. Дарэчы з дадзенай сітуацыяй сутыкнуліся і іншыя незалежныя кандыдаты, якія 28 красавіка беспаспяхова шукалі абласную камісію па афіцыйнаму месцу знаходжання і толькі у Цэнтрвыбаркаме знайшлі адрас Уладзіміра Мядзелеца, старшыні абласной камісіі.

Л. Антонаў.

ПОСЛАНИЯ ГЛАВЫ ГОСУДАРСТВА: СЛОВА И ДЕЛА

С ежегодным посланием к Национальному собранию и народу Александр Лукашенко обратится 20 апреля. Накануне мы просмотрели его выступления последних трех лет и сравнили, как реализуются его слова на деле.

Вот лишь некоторые тезисы, которыми ублажал слух своих граждан в ежегодных посланиях президент.

Слово: «Неоспоримым преимуществом нашей модели экономического развития является то, что мы не влезли в долги. Кредит – это капкан, в который попадем даже не мы, а наши дети и внуки. Ни в коем случае нельзя допустить, чтобы кредит превратился в средство давления на нашу страну». (2007 год)

Дело: Тот факт, что наша страна все прочнее садится на кредитную иглу, с каждым годом наращивая темпы заимствований, уже не вызывает ни у кого сомнений. К 2010 году Беларусь успела наскрести по сусекам кредитов на 22 млрд долларов и, судя по всему, не собирается останавливаться на достигнутом. Поменялась и риторика главы государства: в 2009 году он уже заявлял, что, получив международные кредиты, наша страна получила «запас прочности» и ни слова о жизни без долгов как о неоспоримом преимуществе нашей экономической модели.

Слово: «В последнее время, особенно в России многие ёрничают: неужели Лукашенко повезет из Азербайджана, Ирана и Венесуэлы нефть в Беларусь, когда российская выгоднее. Конечно, не повезет». (2007)

Дело: Не прошло и трех лет, как венесуэльская нефть прямиком отправилась в наши края. По железнодорожным путям через Одессу уже побежали первые вагоны с черным золотом. И хоть объемы и экономическая выгода такой сделки выглядят сомнительно, в России уже не ёрничают. Там прямо крутят у виска.

Слово: «Если и будет приватизация, она будет открытой и честной. Никакой номенклатурной, клановой, как я сказал, и недобросовестной приватизации в стране не будет… Объекты будут продаваться только по конкурсу или через аукцион... Конкурировать между собой будут не фамилии или покровители, а бизнес–планы и социальные программы по поддержке трудового коллектива» (2007).

Дело: Насколько честна и прозрачна у нас приватизация, можно пронаблюдать на ряде недавних сделок. Достаточно припомнить продажу лакомого куска в центре Минска, который достался Оману за символическую сумму в 10 млн. долларов. Не менее «темной» оказалась и история с продажей госпакета акций СП МЦС (Velcom). Оглашения суммы вырученных средств пресса не могла добиться очень долго. В той же череде стоит и покупка швейцарской компанией Franck Muller часового завода «Луч»… Кстати, относительно последнего, слова тоже несколько разошлись с делом.

Слово: «Но главная задача здесь еще состоит и в том, чтобы сохранить это производство в стране. Оно исторически принадлежит нашей стране. Точно так по часовому заводу. Не знаю, чего там ждут и правительство и Павлов. Ждут, когда я приеду на часовой завод, губят его и дальше, некоторые говорят, давайте его закроем. Людей трудоустроим – не проблема. Вопрос не в этом – можно и МТЗ закрыть, и МАЗ закрыть. Так а с чем мы останемся? Это тоже наш брэнд. Сегодня часы, оказывается, в мире выпускают меньше стран, чем самолеты. Это высочайший уровень технологий».

Дело: Чем закончилось сохранение «брэнда», всем известно. Завод продали швейцарцам за 12,41 миллиона долларов. Эксперты назвали эту сделку полным абсурдом и предположили, что она нужна была только для того, чтобы прикрыть какие-то другие, которые не афишируются.

Слово: «С 1 апреля (2009 года – «С») в убыток работать преступно. Работа в убыток — это завтрашняя катастрофа. То же касается и работы на склад… Мы будем на корню пресекать попытки иждивенческих настроений у хозяйствующих субъектов».

Дело: На 1 февраля складские запасы составили 75,3%. При этом рост запасов зафиксирован во всех отраслях белорусской промышленности. С чистым убытком на конец 2009 года сработало каждое пятое предприятие — 18,6%. Сумма убытка составила 785,9 млрд рублей, или в 3,5 раза больше, чем в аналогичный период прошлого года. В общем, на лицо преступный замысел.

Слово: «С нынешнего года мы принципиально изменим подходы к оценке работы сельхозпредприятий. Сейте то, что будет приносить прибыль. Но на государственные дотации не рассчитывайте».

Дело: Слова о сокращении дотаций сельскому хозяйству звучат из уст президента с завидным постоянством. Между тем, по словам вице-премьера Ивана Бамбизы, только в 2009 году на аграрный сектор из бюджетов всех уровней было направлено 4,6 трлн рублей, что на 30% выше уровня 2008 года. Вместе с тем, несмотря на такую поддержку, рентабельности в сельхозорганизациях снизилась до 14,2% против 18,7% в предыдущем году, в том числе от реализации продукции — 4,2% против 6,3%. Это при том, что планы стояли амбициозные — обеспечить уровень рентабельности сельхозпроизводства не ниже 22-25%. Снизилась также чистая прибыль предприятий сельского хозяйства. Она составила 1,4 трлн рублей, или 86% к уровню 2008 года.

Слово: «Налоги призваны стимулировать плательщиков к легальной уплате налогов и сборов. Схема налогов должна быть простой и понятной» (2008 год).

Дело: Казалось бы, некоторые подвижки в этой области были сделаны. Однако в ноябре 2009 года Всемирный банк, Международная финансовая корпорация и PricewaterhouseCoopers опубликовали шестое ежегодное исследование «Уплата налогов 2010. Международный обзор». В рейтинге по простоте уплаты налогов Беларусь в очередной раз заняла последнее 183-е место.

Слово: «Основной вопрос, который будоражит наши умы: кто же будет строить станцию в Беларуси. Этот вопрос в кулуарах решаться не будет. Это будет открытый конкурс. Конечно, нам не хотелось бы – я уже послу России об этом говорил, — чтобы мы складывали яйца в одну корзину. Мы зависим и так по другим видам энергии от России, не хотелось бы зависеть и в строительстве АЭС только от Российской Федерации. Это я говорю честно. Мы хотели бы, чтобы АЭС построили, может быть, другие» (2007).

Дело: Как ни «противился» президент, а «честный» конкурс выиграли именно россияне. «Складированию яиц» существенно поспособствовал обещанный Россией под строительство АЭС кредит. А конкуренты отдыхают: «Слушайте, посмешище! Мы им предлагаем за блок почти два миллиарда долларов, а они перед нами ставят условия, какое у вас будет предвыборное законодательство...», — возмущался президент.

Слово: «Задача правительства, всех республиканских и местных органов управления — даже в условиях роста цен на энергоносители сохранить в этом году (2007-м – «С») положительную динамику снижения темпов инфляции и по итогам года выйти на целевые параметры, предусмотренные в прогнозе социально–экономического развития страны, — 6—8%».

